паводзін дзяцей, падлеткаў, юнацтва; культурна-адпачынкавую работу ў мікрасоцыуме. Новая прафесія мае патрэбу ў навукова-педагагічным абгрунтаванні, распрацоўцы ўмоў, шляхоў і сродкаў павышэння выхаваўчай дзейнасці, вызначэнні неабходных стандартаў. Прыярытэты ў пытаннях выхавання пераносяцца ў галіну педагогікі адносін, сацыяльнай педагогікі, фарміравання педагагічна арыентаванай інфраструктуры мікрасоцыуму, паўнацэннага выкарыстання спецыфічных магчымасцей сям'і і грамадства, культурнага, інтэлектуальнага, прафесійнага, ідэалагічнага патэнцыялу і мікрасацыяльнага наваколля.

Такім чынам, наспела неабходнасць распрацоўкі якасна новых, у шэрагу выпадкаў альтэрнатыўных падыходаў да сацыякультурных працэсаў; выпрацоўкі адэкватных, сацыяльна абумоўленых параметраў ацэнкі і прагнозу ідэалогіі і паводзінскай структуры асобных груп моладзі, магчымасцей іх адаптацыі, што прадвызначае накіраванасць сістэмы выхавання дзяцей, падлеткаў на іх падрыхтоўку да прынцыпова новага ўзроўню развіцця грамадства, культуры, цывілізацыі.

**Н.Я.Петушко,**
*аспірантка*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ КРАЯЗНАЎЧАЙ І ТЫФЛАКРАЯЗНАЎЧАЙ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭК ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ ПА АДРАДЖЭННІ ДУХОЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Сучаснае адраджэнне бібліятэчнага краязнаўства выклікана перш за ўсё небывалым уздымам нацыянальнай самас-вядомасці, прызнаннем прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей. Яно дапамагае запоўніць у грамадскай свядомасці той духоўны вакуум, аб якім сёння шмат кажуць, бо духоўнасць прывіваецца разам з любоўю да Бацькаўшчыны, дапамагае сфарміраваць пачуццё грамадзянскасці ў чытачоў. Гэта і ёсць мэта бібліятэчнай краязнаўчай і тыфлакраязнаўчай работы. Яна ўключае ў сябе выяўленне, камплектаванне, улік і распаўсюджванне інфармацыі і матэрыялаў аб родным краі, аб жыцці і дзейнасці вядомых людзей — ураджэнцаў дадзенай тэрыторыі, творах мясцовых

аўтараў. Адрозненне краязнаўства ад тыфлакраязнаўства заключаецца ў тым, што апошняе непасрэдна адносіцца да інвалідаў па зроку, іх жыцця і дзейнасці, мясцовых грамадскіх арганізацый невідушчых. Спынімся на некаторых узаемазвязаных аспектах гэтых двух напрамкаў работы.

Каб сфарміраваць паўнацэнныя фонды краязнаўчага зместу, важна валодаць інфармацыяй аб тым, што выходзіць у мясцовых выдавецтвах. Таму бібліятэкары цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы для інвалідаў па зроку знаёмяцца з выдавецкімі планамі, наведваюць выставы новай краязнаўчай літаратуры ў абласных бібліятэках, супрацоўнічаюць з музеямі, архівамі. Гэта дазваляе ажыццяўляць найбольш старанны адбор тыфладакументаў для набыцця, іх кумуляцыі і адлюстравання ў бібліяграфічных даведніках, якія распаўсюджваюцца паміж бібліятэкамі сістэмы.

Як правіла, пытанне аб набыцці і рэпрадуктаванні таго або іншага дакумента краязнаўчага зместу вырашаецца з улікам патэнцыяльных чытацкіх патрабаванняў. Спачатку агучваюцца кнігі, якія арыентаваны на шырокія колы чытачоў: мастацкія творы мясцовых аўтараў, у тым ліку невідушчых, навукова-папулярная літаратура, кнігі на беларускай мове.

Другі важны аспект работы — адлюстраванне фондаў у даведачна-бібліяграфічным апараце. Кваліфікацыйныя бібліёграфы ажыццяўляюць роспіс усіх мясцовых выданняў, вядуць картатэкі краязнаўчых матэрыялаў у традыцыйным і электронным выглядзе, афармляюць тэматычныя папкі артыкулаў з часопісаў і газет, выпускаюць бягучыя бібліяграфіныя спісы літаратуры, складаюць даведнікі аб краі і творах мясцовых аўтараў.

Цэнтральная бібліятэка шмат намаганняў затрачвае на складанне і выпуск персанальных біябіяграфічных даведнікаў. Толькі за апошні год выйшлі паказальнікі, якія прысвечаны 75-годдзю невідушчых пісьменнікаў, членаў Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь, М.Шутэнка і М.Лук'янава.

У краязнаўчай і тыфлакраязнаўчай рабоце спецыялісты бібліятэк праяўляюць ініцыятыву і творчы падыход, выкарыстоўваюць разнастайныя формы. Гэтаму садзейнічаюць цесныя кантакты з культурна-асветніцкім цэнтрам Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, школамі-інтэрнатамі, абласнымі і пярвічнымі арганізацыямі невідушчых. Найбольш поўнае азнаямленне чытачоў з краязнаўчай літаратурай адбываецца ў перыяд сумеснай падрыхтоўкі бібліятэк сістэмы да знамянальных

дат і ў дні святкавання. Напрыклад, цыклы цікавых мерапрыемстваў, якія прысвечаны 75-годдзю Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, яе заслужаных дзеячаў, праходзілі ва ўсіх бібліятэках сістэмы.

Асаблівую ўвагу спецыялісты бібліятэк удзяляюць пытанням выхавання экалагічнай культуры сваіх чытачоў, арганізуюць цыклы выстаў, тэматычныя вечарыны і агляды-конкурсы, якія прысвечаны унікальным і запаветным куткам Беларусі: "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі", "Квітней, мой край беларускі", "Чалавек і прырода", "Зямля ў нас адна" і інш.

Паколькі ў чытацкай аўдыторыі пераважна людзі старэйшага і пажылога ўзросту, то часта выбіраюцца традыцыйныя формы мерапрыемстваў, якім яны звычайна аддаюць перавагу: гутаркі, вусныя часопісы, радыёчытанні. Аднак праводзяцца і такія мерапрыемствы, якія маюць на ўвазе найбольшую актыўнасць удзельнікаў, веданне імі традыцый беларускага народа, яго фальклору (фестываль сатыры і гумару "Дамавік-99").

Шмат мерапрыемстваў па тыфлакраязнаўстве праводзіцца ў рамках Тыдня белай тросці, непасрэдна прысвечанай інвалідам па зроку. Так, адбыліся вечарыны-сустрэчы пажылых людзей "Сагрэты цёплым словам", да Дня матулі — "Чалавек, на якім трымаецца дом".

Практычна тыфлакраязнаўства ўваходзіць састаўной часткай ва ўсе мерапрыемствы і садзейнічае развіццю вопыту арганізацыі і правядзення інтэграваных формаў масавай работы, у якіх сумесна ўдзельнічаюць і ўстанаўліваюць цесныя адносіны інваліды і здаровыя чытачы. Прыкладам такога ўзаемадзеяння з'яўляюцца цыклы мерапрыемстваў, якія прысвечаны 200-годдзю А.С.Пушкіна: "Лампада чыстая кахання", "Невядомы Пушкін", "Падарожжа ў краіну Лукамор'е", а таксама клубы па інтарэсах. Асабліва папулярны ў маладых чытачоў паэтычны клуб "Паэзія — душэўны рух", клубы зносін "Суразмоўнік", "Сям'я". На пасяджэнні запрашаюцца не толькі прафесіяналы, але і самародныя таленты. Больш блізкія гэтай форме работы розныя музыкальныя гасцёўні, дзе можна азнаёміцца з творамі невідушчых музыкантаў, пачуць аўтарскае выкананне. У цэнтральнай бібліятэцы праходзяць творчыя вечарыны таленавітых невідушчых паэтаў і выканаўцаў — В.Патрый, А.Корбуна і інш.

Гэтыя мерапрыемствы дапамагаюць інвалідам па зроку задаволіць свае культурныя патрэбы, паменшыць душэўны дыскамфорт, які звязаны з хваробай.

Тыфлактраязнаўчая работа цесна мяжуецца з рэабілітацыйнай, адукацыйнай дзейнасцю ў сферы вольнага часу. Гэта вельмі важна для папулярызацыі творчых магчымасцей людзей з дэфектамі зроку. Адным з дзейсных сродкаў рэабілітацыі з'яўляецца арганізацыя выстаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва чытачоў: "Усё могуць рукі", "Старажытныя гарады Беларусі". Арганізаваны клуб "Сваімі рукамі", у якім невідушчыя навучаюцца рукадзеллю, разьбе па дрэве.

Паступова ўмацоўваюцца кантакты бібліятэк з мясцовымі сродкамі масавай інфармацыі. Цыклы перадач "Лёс мой і надзея" (аб Беларускім таварыстве інвалідаў па зроку і яго культурна-асветніцкім цэнтры) прайшлі па нацыянальным тэлебачанні і атрымалі шырокі рэзананс у насельніцтва. Публікацыі аб праблемах невідушчых знайшлі адлюстраванне ў часопісах і газетах: "Адукацыя і выхаванне", "Беларуская думка", "Крок", "Полымя", "Народная воля", "Народная доля", "Цэнтральная газета". Гэта важна і для іншага боку тэфлакраязнаўчай работы — папулярызацыі магчымасцей дзейнасці ўсёй цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы для інвалідаў па зроку. Звычайна яна актывізуецца ў сувязі з юбілейнымі датамі. Напрыклад, у цэнтральнай бібліятэцы адбылася міжнародная канферэнцыя "Бібліятэка для невідушчых: сучасныя падыходы і рашэнні", якая шырока асвятлялася нацыянальнымі сродкамі масавай інфармацыі; былі выдадзены рэкламныя матэрыялы. Такую работу трэба зрабіць рэгулярнай. Неабходна вучыцца рэкламаваць свае паслугі, прадстаўляць бібліятэкі для інвалідаў па зроку як сацыяльна значныя інстытуты, якія выконваюць разнастайныя функцыі: адукацыйную, культурна-асветніцкую, рэабілітацыйную, інфармацыйную, навуковую і вытворчую. Акрамя таго, бібліятэкі для невідушчых у сучасных умовах выступаюць у некаторай меры грамадскім інстытутам, які абараняе інтарэсы невідушчых у плане доступу да інфармацыі і ведаў нараўне са здаровымі людзьмі, без чаго немагчымыя павышэнне культурнага ўроўню і атрыманне паўнацэннай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ